


Рисунок 2. Композиционные приемы Эдгара Пейна C-D

Композицию изображения необходимо начать изучать до того, как будут сделаны первые отметки на холсте; этот аспект имеет основополагающее значение для построения и определения окончательного изображения, чтобы концепция изображения, достигала зрителя с максимально возможной коммуникативной силой.

*Источники и литература:*


1. Ветрова, И. Б. Неформальная композиция: от образа к творчеству / И.Б. Ветрова. - М.: Ижица, 2004. - 176 с.
2. Докучаева Е.Е. Основы художественного анализа произведений искусства: лекционный курс // МГХПА им. С.Г.Строганова. – Москва, 2020.
3. Edgar Alwin Payne. Composition of Outdoor Painting. – Oakland, CA, U.S.A. : Masalai Press, 2005. – P. 118.


## РОЛЯ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ВІЦЕБСКА Ў МАСТАЦКІМ ЖЫЦЦІ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

А.В. Мядзвецкі (Віцебск)

Першымі крокамі да стварэння сістэмы мастацкай адукацыі ў Віцебску можна лічыць канец XIX – пачатак XX стагоддзя, менавіта гэты перыяд можна назваць часам заснавання Віцебскай мастацкай школы. Сістэма мастацкай адукацыі і навучальныя ўстановы, створаныя ў гэты перыяд, адыгралі вельмі важную ролю ў фарміраванні беларускай мастацкай культуры і сталі якаснай пляцоўкай для творчага росту і самаідэнтыфікацыі многіх таленавітых майстроў. Віцебск гэтага часу становіцца месцам, дзе нараджаліся наватарскія ідэі і развіваліся авангардныя мастацкія напрамкі.

Аналізуючы гісторыю развіцця Віцебскай мастацкай школы, неабходна адзначыць наступныя перыяды.

1. Выпускнік Імператарскай Санкт-Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Юрый Майсеевіч Пэн (1854–1937) адыграў важную ролю ў фарміраванні мастацкай атмасферы горада Віцебска. У 1896 годзе па запрашэнні віцебскага губернатара У.А. Левашова Ю. Пэн пыехаў у правінцыйны Віцебск. Губернатар дапамог мастаку з пошукам жылля і арганізацыяй прыватнай мастацкай школы, якая прыносіла яму пастаянны прыбытак. Вытокамі Віцебскай мастацкай школы стала менавіта яго прыватная школа малявання і жывапісу. Паводле архіўных дадзеных, "Школа рисования неклассного художника Императорской Санкт-Петербургской Академии Художеств Юделя Пэна" была адкрыта ў 1897 годзе. Методыка навучання ў школе была заснавана на акадэмічнай схеме: маляванне геаметрычных фігур, натурных нацюрмортаў, заняткі на пленэры. Тэрміны навучання не былі строга рэгламентаваныя, звычайна гэта было ад некалькіх месяцаў да шасці гадоў, аднак некаторыя студэнты наведвалі школу-студыю на працягу значна больш доўгага часу. Да заняткаў дапускаліся не толькі дзеці, але і дарослыя, не выключэннем былі і пенсіянеры.

У прыватнай школе Ю. Пэна асновы мастацкай творчасці асвоіла мноства перспектыўных мастакоў, якія пазней занялі вядучыя пазіцыі ў сусветным мастацтве. Сярод іх можна вылучыць такіх майстроў, як Марк Шагал, Восіп Цадкін, Лазар Лісіцкі і Оскар Мешчанінаў. У ліку выпускнікоў важна ўзгадаць майстроў Савецкай Беларусі – Заіра Азгура, Саламона Юдовіна, Льва Лейтмана, Лазара Рана, Ісака Бароўскага, Пятра Явіча і іншых таленавітых мастакоў.

2. Наступны перыяд развіцця Віцебскай мастацкай школы пачатку XX стагоддзя звязаны з дзейнасцю ў Віцебску Марка Захаравіча Шагала (1887–1895). У 1906 годзе мастак правёў каля двух месяцаў у прыватнай студыі Ю. Пэна. Асноўную адукацыю ён атрымаў у Санкт-Пецярбургу, пачынаючы з 1907 года, калі стаў вучнем Малявальнай школы таварыства заахвочвання мастацтваў пад кіраўніцтвам М.К. Рэрыха. З 1909 па 1911 год ён вучыўся ў Л.С. Бакста і М.В. Дабужынскага ў мастацкай школе, заснаванай Е. Званцавай. Пасля таго як Шагал пераехаў у Парыж, ён уладкаваўся ў вядомым "Улье", дзе жылі і працавалі авангардныя мастакі. У верасні 1918 года ён вярнуўся ў Віцебск, дзе ажыццявіў свае тры галоўныя праекты. Пасля вяртання Шагал актыўна займаўся падрыхтоўкай мерапрыемстваў да першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі праз мастацкія працы ў аддзеле выяўленчых мастацтваў, які ён узначальваў. Другім важным праектам стала арганізацыя мастацкай навучальнай установы, для гэтай мэты яму быў перададзены асабняк І.В. Вішняка, размешчаны на вуліцы Бухарынскай.

Афіцыйнае адкрыццё Віцебскага народнага мастацкага вучылішча (ВНМВ) адбылося 28 студзеня 1919 года. На працягу ўсёй сваёй гісторыі існавання навучальная ўстанова сутыкалася з недахопам кваліфікаваных педагогаў. Першым дырэктарам стаў вядомы петраградскі графік і арганізатар выстаў таварыства "Свет мастацтва" Мсціслаў Дабужынскі (1875–1957). На жаль, ён займаў гэтую пасаду ўсяго тры месяцы, аднак паспеў арганізаваць пачатковую працу майстэрні малюнка і падрыхтоўчага класса. Яго змяніў Марк Шагал, які быў раней кіраўніком жывапіснай майстэрні.

Навучальны працэс у вучылішчы грунтаваўся на прынцыпе майстэрні: кожны выкладчык фарміраваў групу з 25–30 чалавек і выкладаў спецыяльныя прадметы. Структура педагагічнай працы М. Шагала адрознівалася фрагментарнасцю і адсутнасцю дакладнай методыкі; асноўным яе прынцыпам быў дэмакратызм і акцэнт рабіўся на індывідуальныя асаблівасці студэнтаў.

Увосень 1919 года быў рэалізаваны трэці праект Шагала – стварэнне Віцебскага музея сучаснага мастацтва. У мастака не было выразнай канцэпцыі ў выбары экспанатаў і адсутнічаў дакладны план іх размяшчэння; асноўная мэта заключалася ў адкрыцці музея, які б адлюстроўваў самыя розныя сучасныя напрамкі ад рэалізму да абстакцыі.

3. Значнай падзеяй, якая істотна паўплывала на развіццё стылістыкі і форм у мастацкай школе, стала наведванне Віцебска ў канцы кастрычніка 1919 года адным з вядучых дзеячаў рускага авангарду Казімірам Севярынавічам Малевічам (1879–1935). Акрамя чытання лекцый і правядзення абмеркаванняў мастак актыўна ўдзельнічаў у стварэнні эскізаў і арганізацыі мастацкага афармлення горада.

Менавіта ў Віцебску вакол К. Малевіча і яго майстэрні ў мастацкім вучылішчы арганізавалася група аднадумцаў са студэнтаў і выкладчыкаў. Гэта аб'яднанне, канчаткова сфарміраванае да 2-й справаздачнай выставы Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, якая праходзіла з 15 лютага па 1 марта 1920 года, была названа СНОМАС ("Сцвярджальнікі новага мастацтва").

У перыяд з сакавіка па красавік 1920 года мастацкае вычылішча пераўтварылася ў Віцебскія вольныя дзяржаўныя мастацкія майстэрні. Да завяршэння 1919–1920 навучальнага года метадалогія К. Малевіча замацавалася ў Віцебскіх майстэрнях.

Асноўная дзейнасць К. Малевіча ў перыяд яго жыцця ў Віцебску была сканцэнтравана на майстэрні СНОМАС. Вядучымі напрамкамі сталі: стварэнне навучальнай праграмы і педагагічнай сістэмы, а таксама распрацоўка супрэматызму як мастацкага стылю і філасофскага погляду. У 1919–1922 гады ў Віцебску выйшлі тры яго кнігі: «О новых системах в искусстве» (1919), «Супрематизм. 34 рисунка» (1920), «Бог не скинут. Искусство, церковь, фабрика» (1922). У гэты час была падрыхтаваная самая значная тэарэтычная праца Малевіча – «Мир как беспредметность».

Вясной 1921 года К. Малевіч паспрабаваў укараніць свае педагагічныя ідэі на ўсерасійскім узроўні, звярнуўшыся да кіраўніцтва аддзела выяўленчых мастацтваў Наркамасветы з прапановай рэкамендаваць яго праграмы для ўсіх мастацкіх школ Расіі. У адказ ён сутыкнуўся з адкрытай крытыкай як з боку Наркамасветы, так і з боку кіраўнікоў Маскоўскага ВХУТЕМАСа. Гэта крытыка таксама знайшла падтрымку сярод Віцебскага губернскага аддзела адукацыі.

У кантэксце змен у структуры Народнага камісарыята асветы, якія закранулі падпарадкаванне мастацкіх устаноў вышэйшай адукацыі і перагляд іх фінансавага забеспячэння ў межах новай эканамічнай палітыкі, сітуацыя ў Віцебскіх майстэрнях імкліва пагоршылася. У канцы 1921 – пачатку 1922 года Віцебскія вышэйшыя дзяржаўныя тэхнічныя майстэрні былі перайменаваны ў Віцебскі мастацка-практычны інстытут. Асаблівую ўвагу ў працэссе навучання пачалі ўдзяляць практычнай частцы. У гэты перыяд рэктарам інстытута была прызначана Вера Ермалаева.

У 1922 годзе фінансаванне ўстаноў вышэйшай адукацыі было спынена і мясцовыя органы ўлады пачалі выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі для рэалізацыі ўласных ідэалагічных мэтаў. Ва ўмовах вострага крызісу ў маі гэтага ж года адбыўся першы і адзіны выпуск у інстытуце. Сярод выпускнікоў Т. Бейнаровіч, М. Векслер, І. Гаўрыс, М. Гусеў, Н. Коган, Р.І. Наскоў, М.М. Суецін, Л.М. Хідэкель, І.Р. Чашнік і Л.А. Юдзін.

Летам 1922 года К. Малевіч трапіў пад рэзкую крытыку ад губернскага аддзела адукацыі і прафсаюза работнікаў мастацтва за сваю мастацка-педагагічную дзейнасць, пакінуў Віцебск і пераехаў у Петраград. Услед за ім пераехалі В.М. Ермалаева, Н.О. Коган і іншыя яго вучні-супрэматысты. Усе яго спробы адрадзіць СНОМАС на новым месцы не былі паспяховымі.

Увосень 1922 года школа сутыкнулася з сур'ёзнымі праблемамі па прычыне ад'езду выкладчыкаў і студэнтаў, недахопу фінансавых сродкаў і мастацкіх матэрыялаў. Частку памяшканняў першага паверха будынку планавалася перадаць музычнаму тэхнікуму. Іван Гаўрыс, які выконваў абавязкі рэктара, не змог выправіць сітуацыю, прарэктарам па вучэбнай рабоце ў гэты час стаў Ю.М. Пэн, кіраўнікамі майстэрняў – С.Б. Юдовін (1892–1954), Я.С. Мінін (1897–1937), А.М. Бразер (1892–1942).

Паслярэвалюцыйны перыяд Віцебскай мастацкай школы звязаны з узнікненнем дзяржаўнай мастацкай адукацыі ў новых сацыяльных умовах, калі прадстаўнікамі крайніх левых напрамкаў рускага авангарду належала вядучая роля ў мастацкім жыцці і ў новай педагагічнай сістэме.

Стварэнне дзяржаўнай мастацкай навучальнай установы ў Віцебску непарыўна звязана з іменем Марка Шагала, які актыўна займаўся афармленнем гораду да святаў і стварыў музей сучаснага мастацтва на базе выучылішча. Казімір Малевіч таксама аказаў значны ўплыў на развіццё Віцебскай мастацкай школы, што дазволіла Е.Ф. Коўтану (1928–1996) ахарактарызваць гэты час як "віцебскі супрэматычны рэнесанс". Віцебскі перыяд стаў ключавым для К. Малевіча, дзе ён змог дакладна сфармуліраваць і рэалізаваць свае навуковыя і мастацка-педагагічныя прынцыпы.

*Крыніцы і літаратура:*

1. Исаков, Г.П. Из истории коллекции Витебского музея современного искусства (1919–1941 гг.) / Г.П. Исаков // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2001. – № 1. – С. 53–58.

2. Шишанов, В.А. Витебский музей современного искусства: история создания и коллекции (1918–1941) / В.А. Шишанов. – Минск: Медисонт, 2007. – 144 с.

3. Казовский, Г. Художники Витебска. Иегуда Пэн и его ученики / Г. Казовский. – М.: Имидж, 1992. – 180 с. – (Шедевры еврейского искусства).

## ДА ПЫТАННЯ ТРАДЫЦЫІ Ў ГІСТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЫ

С.В. Мядзвецкі (Віцебск)

Значныя перамены ў гісторыі Віцебскай мастацкай школы звязаны са стварэннем і далейшым развіццём Віцебскага мастацкага тэхнікума. Летам 1923 года кіраўніцтва Віцебскай губерні вырашыла пераўтварыць мастацка-практычны інстытут у мастацкі тэхнікум. Замест звольненага І.Т. Гаўрыса новым дырэктарам быў прызначаны скульптар М.А. Керзін, які да гэтага ўзначальваў ганчарна-керамічную школу ў горадзе Веліжы. Міхаіл Керзін, у сваю чаргу, заахвоціў да працы ў Віцебску сваіх калег з Веліжа, выкладчыкаў-мастакоў В.У. Волкава, М.Р. Эндэ, У.Я. Хрусталёва і М.В. Лебедзеву.

Па ўказанні кіраўніцтва Губернскага аддзела адукацыі і са згоды губернскага прафсаюза работнікаў мастацтва тэхнікум быў перанесены з будынка на вуліцы Бухарынскай, дзе раней размяшчаўся мастацка-практычны інстытут, у не вельмі зручныя ўмовы старой сінагогі на вуліцы Валадарскага, якая была хутка адаптаваная пад патрэбы мастацкай школы. Тым не менш, да восені 1924 года тэхнікуму ўсё ж удалося атрымаць больш прыдатнае памяшканне на перакрыжаванні вуліц Валадарскага і Біржавай (цяпер вуліца Суворава, тут знаходзіцца дзіцячая мастацкая школа № 1 горада Віцебска).

Дырэктар і большая частка педагогаў тэхнікума, якія прыбылі з Веліжа, прытрымліваліся акадэмічных традыцый у навучанні. Сам М. Керзін на працягу ўсяго свайго жыцця заставаўся прыхільнікам рэалістычнага стылю. З'яўляючыся перакананым праціўнікам фармалізму, ён сістэматычна крытыкаваў нефігуратыўнае мастацтва як у паслярэвалюцыйны час, так і ў 1930-я гады, калі сацыялістычны рэалізм зацвердзіў свае пазіцыі як афіцыйны мастацкі стыль савецкай дзяржавы.

Варта адзначыць, што за ўвесь перыяд свайго існавання новая навучальная ўстанова пераназывалася некалькі разоў. Калі з лета 1923 г. яна называлася Віцебскі мастацкі тэхнікум, то на пачатку 1924 года Віцебск, разам з шэрагам паветаў Віцебскай губерні, стаў часткай БССР. Мастацкі тэхнікум быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны мастацкі тэхнікум (БДзМТ), а з 1934 года да чэрвеня 1941 года навучальная ўстанова функцыянавала як Віцебскае мастацкае вучылішча. Менавіта гэтая навучаль-